**Махновіч А.В.,** студэнтка 318гр.

Навуковы кіраўнік – Новік В.М.

# ТРАДЫЦЫІ І НАВАТАРСТВА Ў СУЧАСНАЙ ХАРАВОЙ МУЗЫЦЫ НА ПРЫКЛАДЗЕ ХАРАВОЙ ТВОРЧАСЦІ А. РАШЧЫНСКАГА

Аляксандр Уладзіміравіч Рашчынскі нарадзіўся ў горадзе Лагойску Мінскай вобласці (1949). Закончыў ДМПІ (Масква) па класу харавога дырыжырывання В.А. Благаабразавай (1975), Беларускую дзяржаўную кансерваторыю па класу кампазіцыі прафесара Я.А. Глебава (1984) і пад яго ж кіраўніцтвам асістэнтуру-стажыроўку (1986). Член СК Беларусі (1985). Беларускі кампазітар, дырыжор, педагог, збіральнік беларускага фальклору. Музычны кіраўнік ансамбля «Харошкі», квартэта «Купалінка», групы-капэлла аўтэнтычнага фальклору «Агмень».

Аляксандр Рашчынскі ярка заявіў аб сабе ў розных музычных жанрах – сімфанічным, народна-аркестравым, вакальна-інструментальным. Найбольш значнае месца ў яго творчасці займае музыка, звязаная з беларускім песенна-танцавальным фальклорам [1,с.309].

Інтарэс да народнай творчасці праявіўся ў кампазітара яшчэ да паступлення ў Беларускую кансерваторыю, у час яго працы музычным кіраўніком фальклорна-харэаграфічнага ансамбля «Харошкі». Для гэтага калектыву ім быў напісаны шэраг канцэртных п‘ес, якія трывала ўвайшлі ў рэпертуар ансамбля. Адначасова з'явіліся арыгінальныя апрацоўкі народных песень для фальклорнага ансамбля «Купалінка» і народных спевакоў, што прынесла вядомасць масць як выканаўцам, так і пачынаючаму кампазітару.

У гады вучобы ў Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі малады

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

кампазітар звярнуўся да камерна-інструментальнай, вакальнай і харавой музыкі. Значнытвор гэтага перыяду –канцэрт для хору «Памяці ахвяр фашызму». Ён напісаныўновай манеры, дзе выбар музычна-выразныхсродкаўсведчыцьаб павароце кампазітара дасучаснай музычнай стылістыкі. Музыцы ўласціва ўнутраная сканцэнтраванасць і стрыманасць, суровасць гучання стварае карціну трагічных падзей.

Бясспрэчных поспехаў А. Рашчынскі дасягнуў і ў галіне вакальнага жанру. Яго харавая музыка абапіраецца на фальклорную стылістыку, цесна звязанную з народным выкананнем, што з‘яўляецца адной з характэрных рыс творчага метаду кампазітара. У жанры апрацоўкі беларускіх народных песень кампазітар беражліва абыходзіцца з фальклорным меласам, імкнучыся пры гэтым да новых выразных магчымасцей інтанацыйнага сінтэзу, глыбока і тонка трактуе народны інтструментарый.

У галіне буйной формы – у араторыі, кантаце, сімфоніі – А. Рашчынскі імкнецца да ўвасаблення значных ідэй. Стыль яго музыкі цесна звязаны з сучаснай музычнай мовай, з шырокім выкарыстаннем новых сродкаў выразнаці. Асаблівую ўвагу ён удзяляе тэмбравай афарбоўцы, гукавому каларыту, якія не пераходзяць у знешнюю ілюстатыўнасць.

На працягу некалькіх гадоў А. Рашчынскі займаўся збіраннем беларускага песенна- танцавальнага фальклору. Яго расшыфроўкі і апрацоўкі для розных інструментальных і вакальна-інструментальных ансамбляў складаюць неад‘емную частку творчасці кампазітара [1,с.310].

Рашчынскі быў адначасова і выдатным аранжыроўшчыкам, што вынікала з яго вопыту творчай працы з харавымі і вакальнымі калектывамі. Так, вядомыя яго пералажэнні дл жаночага хору асобных нумароў з харавога цыкла Леаніда Захлеўнага «Песні беларускага Паазер‘я» (запіс мелодыі З.Я. Мажэйка). Сярод іх вылучаецца сваёй іскрамётнасцю рытма і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гарэзлівасцю характара мелодыі нумар «Грознаі тучкі» – праз сольныя запевы сапрана і інструментальны акампанімент «восьмымі» астатніх партый, аздобленых сінкапіраванным рытмам. Вяршыняй у выкананні харавых твораў кампазітара з‘яўляецца балада на народныя тэксты «Брацетка і сястрыца», напісаныя для жаночага 4х- галоснага хору. Пераменная метрыка: 2/4; 8/8; 7/8; ¾; пастаянная змена фактуры, тэмпавыя і дынамічная агогіка на працягу ўсяго хора, шумавыя эфекты (адстукване рытма нагою), разнастайныя выканаўчыя штрыхі ( акцэнты, глісанда, стаката), ферматы на розных нотных долях і паўзах, фактурныя эфекты (праз уключэнні аласоў на розныя склады адной фразы), розна вымаўленні тэкста, што патрабуе ад выканаўцаў поўнай канцэнтрацыі ўвагі (выканальніцкай дысцыпліны), выдатных вакальна-харавых навыкаў. Харавая апрацоўка з‘яўляецца яркім узорам адвольнага рытмічнага вар‘іравання і адным з прыкладаў для навучальнага працэса. Адметнай асаблівасцю апрацоўкі народнай балады ёсць і яе меладычная лінія, пабудаваная праз секвенцыю ў пераменнай ладава- інтанацыйнай сферы, на вялікатэрцавых, кварта- квінтовых асноўных гуках «фа – сі-бемоль». Гукавы фон партытуры аздоблены гетэрафоннымі сугуччамі і арганнымі пунктамі. Харавыя апрацоўкі,як і іншыя творы кампазітара, сёння і надалей,будуць прываблівaць сваёй непаўторнасцю, арыгінальнасцю праз яго любоў да роднай зямлі і вернасцю свайму творчаму прызванню [2,с.374].

Творы

Вакальная-сімфанічная музыка

Араторыі: «Смутак памяці» для салістаў,хору, «Смяротная калыханка», сл. А. Жыгунова і т.д.

Кантата: «Дзіцячыя песні» («Калыханка», «Забаўлянка», «Дражнілка», «Грушка», сл. народныя, 1982).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Аркестравая музыка

Для сімфанічнага аркестра: Сімфонія(1983), Сюіта(1985).

Камерна- інтрументальная музыка

Для фартэпіяна: Песня,Гумарэска,Саната і т.д.

Для эстрадных ансамбляў : «Мітусь», «Вясковыя жарты» (1983) і т.д.

Вакальная музыка

Для хору а капэла: «Кацілася ды ясная зорачка» (сл. народныя, 1981), «Сум», «Смутак», «Крынічка» (сл. В. Лукшы, 1986), «А ў ляску, ляску» (1981), «Ой, там, на гарэ» і т.д.

Для вакальнага ансамбля

Апрацоўкі беларускіх народных песень: «Ажаніла маці», «Каваль» «Бабка Еўка» і т.д.

Для хора з суправаджэннем: «Піянерскі збор» (сл. В. Лукшы,1986), «Паклон табе,мой беларускі краю», «Добрай раніцы», «Косіць хлопец канюшыну» і т.д.

Для голасу з суправаджэннем. Рамансы: «В ночи, когда уснет тревога» (сл. А. Блока, 1980), «Лявоніха», «Купаленка» і т.д.

У верасні 2016 года ў Мінску створаны народны хор імя Аляксандра Рашчынскага , хормайстар Давгаполава Ганна.

1. Мдзівані, Г.Т., Сергіенка І.Р. Кампазітары Беларусі / Т.Г. Мдзівані, Р.І. Сергіенка – Мн. : Беларусь, 1997. – 400 с.: іл.

2. Мдивани, Г.Т., Гудей-Каштальян Г.В. Композиторы Беларуси / Т.Г. Мдивани, В.Г. Гудей-Каштальян; предисл. Т.Г. Мдивани. – Минск : Беларусь, 2014. – 479с. : ил.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ